**Караленка, В.** Без тэрміну даўнасці / В. Караленка // Патрыёт (Ушачы). — 2009. — 14 лют. — С. 2.

## БЕЗ ТЭРМІНУ ДАЎНАСЦІ

***Дваццаць гадоў таму я сядзела ў аднапакаёвай кватэры Святланы Хрыпач у Полацку і гутарыла пра загінуўшага мужа – капітана Хрыпача. У дзіцячым ложку гуляла гадавалая дзяўчынка, светленькая і як дзве кроплі вады падобная на бацьку. Гэта падабенства ні на хвіліну не давала забыцца. Маладая жанчына нервова пацірала рукі, раздзіраючы іх у кроў. Перабіраць шчаслівыя адэскія фотаздымкі і спакойна расказваць, як любілі гуляць па парку, не атрымлівалася. А яны вельмі многа фатаграфаваліся, быццам спрабавалі спыніць час.***

Міхаіл Паўлавіч Хрыпач наадварот – спяшаўся жыць. Ва ўсялякім выпадку, вярнуўшыся з гадавой камандзіроўкі з Афганістана дадому ў 1984-м, ажаніўся. Пэўна, немагчыма жыць без надзейнага тылу. Ці, наглядзеўшыся на смерць, па-іншаму ўспрымаеш жыццё. Родным ён ніколі не расказваў пра тое, як там. Калі толькі старэйшым братам, і тое вельмі сціпла. У асноўным адмахваўся: «Я не хачу пра гэта гаварыць».

Не проста не хацеў – не мог. Бо і ноччу яго не адпускалі «афганскія віды»: неспакойна спаў, ускрыкваў. Усё трымаў у сабе, як сапраўдны мужчына. Рана пасталеў. За свае 29 ён двойчы быў у працяглых камандзіроўках у Афганістане, у 1986 – у Чарнобыле. У самых гарачых кропках. І чатыры баявыя ордэны, атрымаў з якіх толькі адзін – сведчанне таму, што не проста быў...

З сястрой Маргарытай Паўлаўнай Кірпічонак у іх унушальная розніца. Міша заканчваў 10 клас Гарбацідкай школы і за руку вадзіў у Ляснеўшчынскую яе, першакласніцу. Потым песціў рознымі пачастункамі з уласных заробкаў. Ён штогод прыязджаў у родныя Плігаўкі, апошні раз у маі 1988, калі і забіраў з радзільнага дома жонку і дачку.

Яна ніколі не бачыла бацьку, калі не ўлічваць іх першае знаёмства. Дашы было пяць месяцаў, калі яго не стала. 7 кастрычніка – на дзень нараджэння Міхаіла Паўлавіча і дзень яго смерці (трагічнае супадзенне) на могілках заўсёды сустракаліся маці Марыя Платонаўна, Святлана, Даша. Другім днём памяці было 15 лютага – дзень вываду савецкіх войскаў з Афганістана.

Шэсць гадоў як не стала Марыі Платонаўны. 22 лютага – год, як няма і Святланы. Яна спрабавала жыць без Міхаіла, стварыць новае шчасце, але не змагла, не атрымалася. Цяжка параўноўваць, калі ўсё было надта добра. Так і жыла адна, усю сваю любоў перакінуўшы на дачку. Дашы ў маі спаўніцца 21. Летась яна скончыла педагагічны каледж, экзамены здавала ўжо без маці і таму не паехала ў Віцебскі універсітэт, дзе магла атрымліваць вышэйшую адукацыю па скарочанай праграме. Ў Полацкі дзяржуніверсітэт паступала без усялякіх ільгот, на роўных умовах на спецыяльнасць «Гасціннасць і турызм», атрымалася на платную форму. Даволі складанае зараз матэрыяльнае становішча ў сіраты, жывуць з бабуляй на дзве пенсіі – (да 22 гадоў захаваецца бацькава), нявыплачаны крэдыт за рамонт, што брала маці, але дзяўчына спрабуе жыць самастойна і вельмі неахвотна прымае дапамогу. Мабыць і характар перадаўся бацькаў – у сабе, сама змагу. Яна не адчула яго любоў, але ведае, што яго імя носіць вуліца, што ім ганарацца землякі.

Дваццаць год таму ў Святланы, як і бацькоў Мікалая Ключонка, яшчэ жыла надзея – ён знойдзецца, мабыць недзе ў палоне, гаварылі яны самі сабе, спалучаючы звесткі аб смерці, сны, лісты. Зараз засталася толькі памяць. Ці кароткі яе век? Не адкажаш адназначна. Але пакуль будуць жыць блізкія людзі, яна захаваецца. Пакуль будуць хадзіць па вуліцы капітана Хрыпача ўшачане, будуць задаваць пытанне дзеці, хто такі, гэты ваенны верталётчык. Ён не жыў дарэмна. Ён правільна жыў. І няхай пагасла надзея, затое жывая памяць.

Учора на ўрачысты сход, што адбыўся ў Мінску з нагоды 20-годдзя вываду савецкіх войск з Афганістана, была запрошана і Дар'я Хрыпач.

**В. Караленка**